*А. Г. ЗЕЛЬСКІ, аспірант БДУ*

# ПРАБЛЕМА ХРАНАЛОГІІ ДРУГОГА ПЕРЫЯДУ І ПАНТЫЙСКАЙ (МІТРЫДАТАВАЙ) ВАЙНЫ

Другі перыяд вайны мы храналагічна вызначаем 86–85 гг. да н. э. Уводзімы намі падзел I Пантыйскай вайны на два перыяды карысны з некалькіх прычынаў: па-першае, ён дае магчымасць зразумець, дзе, калі, як і чаму адбыўся пералом у вайне; па-другое, мы здольны разабрацца ў храналогіі падзей вайны. Калі ў першы ўмоўны перыяд храналогія спрэчак у даследчыкаў амаль не выклікае, то пасля бітвы пры Херанэі (сакавік 86 г. да н. э.) у гісторыкаў няма адзінства. Вызначаючы бітву пры Херанэі як кульмінацыйны пункт вайны, мы зыходзім з таго, што хаця пасля і адбыліся не менш значныя бітвы, нам зразумела,

што Пантыйскае царства было ўжо не ў стане выйграць вайну. Войскі Мітрыдата Эўпатара не здолелі разграміць адну рымскую армію ў Грэцыі. Тым больш пантыйцы не змаглі б перамагчы, змагаючыся адначасова супраць двух рымскіх армій.

Цяжкасці ў храналогіі выкліканы тым, што антычныя гісторыкі не пакінулі нам амаль ніякіх датаў. Таму даследванні гісторыкаў могуць, як маляўніча выказаўся Т.Момзен, «у лепшым выпадку ператварыць змрок у прыцемкі» [1].

За зыходны пункт намі ўзята 1 сакавіка 86 г. да н. э. — узяцце Афін рымскім войскам. Хаця гэтая падзея і адносіцца да першага перыяду вайны, але ва ўсіх працах гісторыкаў яна з'яўляецца бясспрэчнай, не выклікаючай рознагалоссяў. Бітва пры Херанэі адбылася ў сакавіку (верагодна, у другой палове месяца) 86 г. да н. э. Прыблізна ў гэты ж час у Грэцыі высадзілася армія В. Флака. Гэта магло адбыцца ў лепшым выпадку ў пачатку сакавіка, бо зімовыя марскія буры і штормы спынялі ўсялякае плаванне. Дзесці ўвесну, пасля бітвы пры Херанэі (магчыма, сярэдзіна красавіка — травень), адбылася сустрэча армій Сулы і Флака ў Фесаліі, якая скончылася без сутыкненняў. Тут мы падыходзім да двух важных падзей — паўстанняў у гарадах Малой Азіі і бітве пры Архамене.

Як вядома, паўстанне адбылося пасля правядзення Мітрыдатам прэвентыўных захадаў супраць галатаў і жыхароў Хіаса (App., Mithr., 46; Memn., XXXIII, 1–3). Гэта магло абыцца толькі пасля бітвы пры Херанэі, бо інакш гэтыя акцыі гублялі сэнс. Пэўны час пайшоў на дзеянні ў Галатыі і на Хіасе — верагодна, канец вясны 86 г. да н. э. У гэты ж час у Эфесе, Смірне, Сардах, Тралах, Калафоне і іншых гарадах пачалося паўстанне (App., Mithr., 48; Strabo., XIV, 1,42), інспірыраванае прарымскі настроенай рабаўладальніцкай арыстакратыяй і гандлеваліхвярскімі коламі, незадаволенымі сацыяльнай палітыкай Мітрыдата. Дзейнічаючы палітыкай бізуна і перніка Мітрыдат здолеў здушыць паўстанне. Аднак замест актыўных баявых дзеянняў у Грэцыі пантыйскае войска было занята падаўленнем мяцяжу, што заняло ў іх, на нашу думку, па часу, большую частку лета 86 г. да н. э.

Наступная значная падзея — бітва пры Архамене. Аднак аб даце бітвы ў гістарыяграфіі няма адзінай думкі. Так, гісторык Т.Момзен лічыць, што бітва адбылася ўвесну 85 г. да н. э., а зіму 86/85 гг. да н. э. Сула правёў у Афінах, хаця сам Т. Момзен у гэтым няўпэўнены [2]. Гэтай жа думкі аб часе бітвы прытрымліваюцца Т. Харботл, Г. Вэбэр, Т.Н. і Р.Э. Дзюпюі, Т. Рэйнак [3]. На думку С.І. Кавалева, Г.М. Ліўшыца і ўкладальнікаў «Всемирной

истории» гэтая бітва адбылася восенню 86 г. да н. э.[4] Большасць астатніх прыводзяць, не ўдакладняючы, проста 86 г.[5]

Антычныя аўтары не пакінулі нам ніякіх звестак аб даце бітвы, таму паспрабуем прыблізна разлічыць яе магчымы час. Вясна-лета 86 г. да н. э. — пасля паразы пры Херанэі ўспыхваюць паўстанні ў гарадах Малой Азіі, неабходны час для іх падаўлення. Наўрад ці такі асцярожны чалавек, як Мітрыдат рызыкнуў бы выправіць дастаткова моцнае войска за межы Малой Азіі да поўнага падаўлення паўстання. Пасля неабходны быў больш-менш працяглы час для збірання новых войскаў, назапашвання сродкаў, зброі і г. д. для новай арміі. З другога боку, высадка Флака, яго супрацьстаянне з Сулай таксама маглі заняць усю вясну і частку лета 86 г. Прыбыцце новай пантыйскай арміі, яе разгортванне ў Беотыі таксама патрабавала часу. Бітва не магла адбыцца і позднюю восенню — малаверагодна, каб Мітрыдат рызыкнуў бы пасылаць морам войскі ў пeрадпачатку восеньскіх штормаў. Атрымліваецца, такім чынам, што бітва пры Архамене хутчэй за ўсе адбылася напрыканцы лета — напачатку восені 86 г. да н. э.

Прыбыцце другой рымскай арміі на чале з Флакам у Азію магло адбыцца ў канцы 86 г. да н. э. Бо ад часу супрацьстаяння з Сулам яна павінна была прайсці, відавочна з баямі, праз Фесалію, Македонію, Фракію і пераправіцца праз Баспор Фракійскі. Да гэтага ж часу адносіцца мяцеж у арміі і забойства Флака па загаду Фімбрыі. Такім чынам, бітва ля Мілетопаля паміж пантыйскай арміяй і войскам Фімбрыі магла адбыцца толькі ўвесну 85 г. да н. э. (зімою баявыя дзеянні, як правіла не вяліся). За тое, што бітва ля Мілетопаля адбылася не раней вясны, гаворыць той факт, што калі пасля разгрому пантыйцы без бою здалі Пергам (Memn., XXXIV, 3) і былі абложаны ў Пітанах, Фімбрыя папрасіў Лукула, чые караблі былі непадалек, блакіраваць порт (Plut., Luc., III). Значыць гэта быў час спрыяльны для плавання.

Наступнай дыскусійнай датай з'яўляецца Дарданскі мір — асабістая сустрэча Сулы і Мітрыдата. Адносна даты гэтай сустрэчы погляды падзяляюцца. Гісторыкі Э. Бікерман і С.І. Кавалёў лічаць, што гэта адбылося ў жніўні 85 г. да н. э.[6] Т. Рэйнак, Р.Э. і Т.Н. Дзюпюі кажуць пра зіму 85/84 гг. да н. э.[7] Т. Момзен, Н.М. Галаўкова — 84 г. да н. э.[8] На думку М. А. Машкіна, Г.М. Ліўшыца гэта восень 85 г. да н. э.[9] У прыблізным вызначэнні гэтай даты трэба абапірацца на ўсю раней-

шую логіку падзей. Як паведамляе Апіян (Mithr., 56), асабістая сустрэча Мітрыдата і Сулы адбылася на раўніне, на вачах абодвух войскаў. Значыць, да гэтага часу Сула пераправіў усю, ці, прынамсі, большую частку арміі. Калі Сула мог высадзіцца ў Азіі? Т. Момзен лічыць, што ў 84 г. да н. э.; В.Т. Савасцьянава — у канцы 85 г. да н. э.[10] Але гэта даволі крайнія даты.

З часу перамоваў ля Дэлія (86/85 гг. да н. э.) кампанія рымлян супраць фракійцаў не магла цягнуцца вельмі доўга, бо Сула спяшаўся, максімум вясну — пачатак лета 85 г. Прыгадаем, што Мітрыдат канчаткова пагадзіўся на мір пасля перамог Фімбрыі, якія таксама адбыліся прыкладна ў гэты час. Таму калі нават улічыць усе цяжкасці пераправы рымскай арміі, то атрымліваецца, што высадка ў Азіі магла адбыцца ў сярэдзіне лета (у крайнім выпадку — напрыканцы) 85 г. да н. э. Пэўны час магла заняць падрыхтоўка да сустрэчы. Адсюль выцякае, што Дарданскі мір сапраўды мог быць заключаны не пазней канца лета — напачатку восені 85 г. да н. э. Прыймальнай датай можа быць і месяц жнівень.

[1] Моммзен Т. История Рима: В 4 т. Ростов-на-Дону, 1997. Т. 2. С. 521.

[2] Моммзен Т. Паказ. твор. С. 520.

[3] Харботл Т. Битвы мировой истории. М., 1993. С. 339; Вебер Г. Всеобщая история: В 4 т. М., 1882. Т. 3. С. 713; Дюпюи Р.Э., Дюпюи Т.Н. Всемирная история войн: В 4 кн. СПб., 1997. Кн. 1. С. 197; Reinach Th. Trois royaumes de l'Asie Mineure: Cappadoce-Bithynie- Pont. Paris., 1888. P. 185.

[4] Ковалев С.И. История Рима. Л., 1986. С. 388; Лившиц Г.М. Классовая борьба в Иудее и восстания против Рима. Мн., 1957. С. 88; Всемирная история: В 10 т. М., 1956. Т. 2. С. 365.

[5] Инар Ф. Сулла. Ростов-на-Дону, 1997. С. 148; Бикерман Э. Хронология древнего мира: Ближний Восток и античность. М., 1975. С. 274; Ломоури Н.Ю. К истории Понтийского царства. Тб., 1979. С. 304.

[6] Бикерман Э. Паказ. твор. С. 274; Ковалев С.И. Паказ. твор. С. 390.

[7] Reinach Th. Op. cit. P. 185; Дюпюи Р.Э., Дюпюи Т.Н. Паказ. твор. С. 197.

[8] Моммзен Т. Там жа. С. 524–526; История войн: В 3 т. Ростов н/Д. М., 1997. Т. 1. С.147.

[9] Машкин Н.А. История Древнего Рима. М., 1956. С. 250; Лившиц Г.М. Паказ. твор. С. 88.

[10] Моммзен Т. Там жа. С.521; Савостьянова О.И. Война Рима с Понтийским царством // История Древнего Рима / Под ред. А.Г. Бокщанина и В.И. Кузищина. М., 1971. С. 196.